# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

4 студзеня 2018 г. № 2 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне выяўленчага, тэатральнага мастацтва, журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, музейнай справы, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2017 года:

аўтарскаму калектыву галоўнай дырэкцыі ”Агенцтва тэлевізійных навін“ Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі ў складзе Атрашэўскага Аляксандра Міхайлавіча, загадчыка аддзела спецыяльных праектаў, Станкевіч Антаніны Францаўны, карэспандэнта спецыяльнага аддзела карэспандэнцкай сеткі, Туркова Руслана Мікалаевіча, загадчыка аддзела крэатыўнага планавання, – за стварэнне хранікальна-дакументальнага серыяла ”Дело жизни“;

аўтарскаму калектыву ўстановы адукацыі ”Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў“ у складзе Амельяновіч Паліны Міхайлаўны, выпускніцы гэтай акадэміі, Касцючэнкі Канстанціна Аляксандравіча, дацэнта кафедры скульптуры, Отчыка Глеба Анатольевіча, старшага выкладчыка кафедры малюнка, жывапісу і скульптуры, – за рэалізацыю праекта комплекснага мастацкага афармлення храма ў гонар святых Касмы і Даміяна ў аг.Вішнева Мінскай вобласці;

Егарэйчанку Сяргею Аляксандравічу, намесніку дырэктара дзяржаўнай установы ”Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік ”Нясвіж“, – за значны ўклад у захаванне гістарычнай спадчыны Рэспублікі Беларусь і выданне кнігі-альбома ”Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Збор зброі і даспехаў“;

калектыву выдавецкага цэнтра ”Марка“ рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі ”Белпошта“ – за значны ўклад у захаванне духоўнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, стварэнне высокамастацкіх

паштовых марак да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і іншых знамянальных падзей у гісторыі і культуры Беларусі;

калектыву дзяржаўнай установы культуры ”Акцябрскі раённы дом рамёстваў“ – за значны ўклад у захаванне, развіццё і папулярызацыю традыцыйных ткацкіх рамёстваў, актыўную выставачную дзейнасць;

калектыву дзяржаўнай установы ”Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ”Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі“ – за значны ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва, паспяховае правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання;

калектыву дзяржаўнай установы ”Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ – за рэалізацыю праекта ”Ад мінулага да сучаснага“, прысвечанага адраджэнню ўнікальных тэхнік шматнітачнага ткацтва Панямоння, і стварэнне калекцый традыцыйнага і сучаснага нацыянальнага адзення;

калектыву дзяржаўнай установы ”Мінскканцэрт“ – за рэалізацыю культурнага праекта ў рамках правядзення летняга музычна-турыстычнага сезона ў Верхнім горадзе;

калектыву ўстановы адукацыі ”Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі“ – за рэалізацыю маштабных творчых праектаў ”Талент краіны“, ”Дакрананне“, ”Пасхальны фестываль“, накіраваных на развіццё здольнасцей таленавітых дзяцей і моладзі;

Слауку Валерыю Пятровічу, мастаку, члену грамадскага аб’яднання ”Беларускі саюз мастакоў“, – за значны асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай школы станковай і кніжнай графікі, правядзенне выстаўкі ”Планета Слаук“ і персанальных выставак у г.Мінску і рэгіёнах Беларусі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2017 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ * 1 *
Для правовых актов

10